Аддзел адукацыі, спорту і турызму Рэчыкага раённага выканаўчага камітэта Гомельскай вобласці
Дзяржаўная ўстанова адукацыі
“Заспенская сярэдняя школа” Рэчыцкага раёна Гомельскай вобласці

# Патрыятычная акцыя “Я ведаю! Я ганаруся!”

намінацыя - апавяданне

Апавяданне
«Я ведаю! Я ганаруся!»,
Ярац Аляксандр Максімавіч,
22.11.2005 г.р., дзяржаўная ўстанова
адукацыі “Заспенская сярэдняя школа”
Рэчыцкага раёна,
5 клас,
вул.Чапаева, д.14, аг.Заспа
настаўнік Ганчарова Жанна Іванаўна

агр. Заспа, Рэчыцкі раён, Гомельская вобласць, 2016

**Я ведаю! Я ганаруся!**

Вайна – гэта не знак бяды,
Яе немагчыма забыць.



Я хачу расказаць пра сваю прабабулю Марыеўскую(Дашкоўскую) Марыю Пятроўну, 1934 года нараджэння.

Калі пачалася вайна, ёй было 7 годзікаў. Яе тата пайшоў на фронт ваяваць з немцамі, а маці засталася дома глядзець маленькіх дзетак. Калі немцы падыходзілі да хаты, яна хавала дзяцей пад падлогай, каб іх не забралі ў палон. Мая прабабуля глядзела сваіх братоў і сясцёр, патрэбна было сядзець ціхенька. Але



аднойчы немцы пачулі, што нехто ёсць пад падлогай. Адкрылі і ўбачылі малых дзяцей. Прабабулю, братоў і сясцёр адправілі ў Германію. Немцы ў маленькіх вязняў бралі кроў для сваіх параненых салдат. Дзяўчынку амаль не кармілі. Давалі толькі піць ваду. Калі – некалі прабабуля атрымлівала кавалачак хлеба. Сама не ела, а дзялілася хлебам з братамі і сёстрамі. Яны ўсю вайну прабылі

вязнямі на нямецкай тэрыторыі.

Закончылася вайна, усіх палонных вярнулі на Радзіму. Дома яны выздаравелі і набраліся сілы. Прабабулі пайшла вучыцца ў 11 гадоў. Прайшоў час і яна выйшла замуж за салдата. Потым у яе нарадзіліся дзве дачкі. Гэта ўжо мае бабулі. Зараз прабабулі 82 гады. У яе чатыры ўнукі, тры праўнукі і адна праўнучка.



Мы часта наведваем прабабулю, а яна нам расказвае цікавыя гісторыі. Я ганаруся сваёй прабабуляй. Яна вытрымала ўсё, што наканавана ёй лёсам, і засталася добрай, ласкавай, сардэчнай жанчынай.

